УСЕ НА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР!

Выбярэм у соцыялістычны парламент рэспублікі палкіх патрыётаў-совецкай радэімы

Савіцкі Парфен Пятровіч — кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Кагановіцкай выбарчай акрузе гор. Менска. Другі оакратар Менскага гаркома партыі.

ГАЛАСУЮ ЗА тав. САВІЦКАГА

Сёння, 26 чэрвеня, радаснае ўсенароднае свята — дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Працоўныя БССР, разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза, сёння яшчэ раз прадэманструюць сваё несакрушымае маральнае і палітычнае адзінства, адданасць і згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна.

Мы з радасцю будзем галасаваць за кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, выберам у Вярхоўны Совет БССР лепшых людзей нашай краіны, доблесных патрыётаў соцыялістычнай радзімы і сярод іх першым будзе выбран той, чыё імя з'яўляецца сцягам нашых перамог, нашага шчаслівага, радаснага жыцця — творац самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі вялікі Сталін.

Разам з усім беларускім народам я з пачуццём вялікай радасці і шчасця сёння аддам свой голас за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за аднаго з лепшых сыноў беларускага народа — за таварыша Савіцкага Парфена Пятровіча.

Наша партыя большэвікоў і вялікі Сталін стварылі для нас радаснае, сонечнае жыццё, якое мы да апошняй кроплі крыві будзем абараняць ад замежных і ўнутраных ворагаў.

Я з вялікай радасцю 26 чэрвеня буду галасаваць за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — тав. Савіцкага, за партыю большэвікоў, за нашу квітнеючую радзіму, за светлае, радаснае жыццё.

Аспірант ШАБУНЯ.

Галасуем за радаснае, шчаслівае жыццё

Увесь беларускі народ сёння, 26 чэрвеня, аддае свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Выбаршчыкі 4 выбарчага ўчастка Кагановіцкай выбарчай акругі заяўляюць, што яны аднадушна і з радасцю будуць галасаваць за аднаго з лепшых сыноў беларускага народа тав. Савіцкага Парфена Пятровіча.

Выбаршчык Дунер А. заявіў, што ўся яго сям'я ў колькасці 7 чалавек будзе галасаваць за нашу партыю, за яе лепшага прадстаўніка, кандыдата блока комуністаў і беспартыйных тав. Савіцкага.

Выбаршчык Хоміч Сафрон сказаў, што самае радаснае ў яго жыцці — гэта яго 4 сыны, выхаваныя совецкай уладай і комуністычнай партыяй.

Усе слухачы майго гуртка заявілі, што яны, разам з усімі працоўнымі БССР, 26 чэрвеня пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі з радасцю пойдуць да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных тав. Савіцкага.

— Галасуючы за тав. Савіцкага, — заявілі яны, — мы галасуем за партыю Леніна—Сталіна, за шчаслівае і радаснае жыццё.

Агітатар ЦЯРЭШАНКА.

Аддам свой голас за нашага кандыдата тав. Парфена Пятровіча САВІЦКАГА

Выбаршчыкі, хатнія гаспадыні з вялікай радасцю чакалі ўсенароднага свята 26 чэрвеня, калі яны апусцяць свае бюлетэні за тав. Савіцкага.

Я буду галасаваць разам з сваім гуртком хатніх гаспадынь, у якім дэтальна азнаёміліся з жыццёвым шляхам нашага кандыдата. Шлях ён прайшоў цяжкі, але слаўны. Былы батрак, плытагон становіцца дзяржаўным дзеячом.

Мы упэўнены, што тав. Савіцкі апраўдае давер'е народа і будзе верным яго слугой у вярхоўным органе ўлады Беларускай соцыялістычнай рэспублікі.

Таварышы выбаршчыкі! Я заклікаю вас аддаць свае галасы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных. Галасуючы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных, мы галасуем за партыю большэвікоў, за вялікага правадыра народаў вялікага Сталіна.

Агітатар ЧАРНЯЎСКІ.

Бязмежна радасць беларускага народа

Усе працоўныя Совецкай Беларусі з бязмежнай радасцю чакаюць гістарычнага дня 26 чэрвеня—дня выбараў у Вярхоўны Совет Беларускай Соцыялістычнай рэспублікі. У гэты дзень усе працоўныя Беларусі аднадушна аддадуць свае галасы за кандыдатаў, выстаўленых партыяй большэвікоў у саюзе з беспартыйнымі. Працоўныя ў гэты дзень пашлюць у Вярхоўны Совет БССР самых лепшых сыноў і дачок совецкага народа, стойкіх барацьбітоў за справу Леніна — Сталіна.

Дзень выбараў, 26 чэрвеня 1938 года, — вялікае ўсенароднае свята згуртаванасці працоўных Совецкай Беларусі вакол большэвіцкага сцяга Леніна — Сталіна.

Выбаршчыкі 4 выбарчага ўчастка Кагановіцкай выбарчай акругі сёння будуць галасаваць за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных тав. Савіцкага Парфена Пятровіча.

В. БЕЛЯЎСКІ,
выбаршчык 4 выбарчага ўчастка Кагановіцкай выбарчай акругі.

Галасуйце за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных

Мы з вялікай радасцю сустракаем наша ўсенароднае свята 26 чэрвеня. Нашы агітатары тав. Чарняўскі і Шакаль дапамаглі нам падрабязна вывучыць жыццёвы шлях усенароднага дэпутата правадыра народаў таварыша Сталіна. Мы таксама падрабязна азнаёміліся з біяграфіяй кандыдата у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Савіцкага.

За кандыдата блока комуністаў і беспартыйных тав. Савіцкага мы сёння аддаем свае галасы.

Таварышы выбаршчыкі! Галасуйце за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных, за стойкага большэвіка, за вернага сына партыі Леніна—Сталіна Парфена Пятровіча Савіцкага.

Выбаршчыкі 4 выбарчага ўчастка, Кагановіцкай выбарчай акругі, хатнія гаспадыні — **Барысевіч Е., Вашкевіч М., Ронжына М., Каоцевіч Е., Барысевіч К., Юркевіч Н.**

У другі раз аддаю свой голас за партыю большэвікоў

Сёння — усенароднае свята працоўных Беларусі. У гэты дзень мы пойдзем да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок беларускага народа, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

З пачуццём вялікай гордасці і радасці я сёння галасую за лепшага сына беларускага народа, стойкага большэвіка-сталінца — Парфена Пятровіча Савіцкага. Галасуючы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных, за тав. Савіцкага, я галасую за нашу родную партыю большэвікоў, за дарагога і мудрага правадыра, настаўніка ўсіх працоўных таварыша Сталіна, які вядзе нашу квітнеючую краіну ад перамогі да перамогі.

ЦЭНТАР,
выбаршчыца 4 выбарчага ўчастка Кагановіцкай выбарчай акругі.

За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных

26 чэрвеня мы ўсе, як адзін чалавек, пойдзем к выбарчым урнам, каб галасаваць за кандыдатаў у Вярхоўны Совет БССР, вылучаных блокам комуністаў і беспартыйных. Кожны свядомы грамадзянін Совецкага Саюза ясна ўявіць сабе, чаму ён галасуе за блок комуністаў і беспартыйных.

У дні сваей моладасці я жыў і працаваў ва ўмовах «жестоких нравов» царскай Расіі. Тагочасны праклятый эксплаататарскі лад выжымаў пот і кроў з рабочых і сялян і давіў усякую чэсную жывую мысль, узводзіў у асноўны закон паліцэйскую нагайку і рэлігійны дурман. «Горелово, Неелово, Неурожайка тож» — вось меткія імёны, якімі назваў Некрасаў тыповую вёску царскай Расіі. Для заняволеных царызмам народаў Расія была турмой, асуджаўшай іх на выміранне. Навука ў царскай Расіі была пастаўлена пад нагляд жандармаў і папоў. Народныя масы наўмысля трымаліся ў невуцтве, бо эксплаататары, як агню, палохаліся прабуджэння класавай свядомасці ў прыгнечаных і баяліся, што нават простая пісьменнасць можа аказацца небяспечнай для іх панавання. Зямля руска, гаворачы словамі Некрасава, была «преисполнена великою скорбью народной», морам народнага жалю, затапіўшы ўсю велізную тэрыторыю імперыі.

Тады я марыў аб тым, што прыйдзе-ж, нарэшце, час, калі рухне праклятый эксплаататарскі лад, калі Расія стане сапраўды свабоднай, багатай і культурнай краінай. Мае мары ажыццявіліся. Я перажываю цяпер найвялікшае шчасце. Совецкі Саюз на маіх вачах за апошнія дзесяць год ператварыўся нібы ў казцы. Ён зрабіўся вялікай, магутнай, свабоднай, багатай і культурнай краінай, аснашчонай лепшай у свеце навукай і тэхнікай, абароненай лепшай у свеце непераможнай Чырвонай Арміяй. Знішчана эксплаатацыя чалавека чалавекам, і праца з катаржнай кабалы стала справай доблесці і гераізма. Рэлігійнаму дурману нанесен сакрушальны ўдар, навука і асвета ўзняты на небывалую вышыню і сталі сапраўды ўсенародным здабыткам.

Учарашнія рабочыя ад станка і земляробы ад калгасных палёў кіруюць дзяржавай. З турмы народаў, якой была царская Расія, Совецкі Саюз ператварыўся ў соцыялістычную радзіму народаў, якія жывуць у цесным брацкім саюзе. Совецкі Саюз стаў аплотам міру і культуры, пуцяводнай зоркай для прыгнечаных ва ўсім свеце, надзеяй для ўсяго працоўнага і культурнага чалавецтва. Мора жалю змянілася морам радасці. Жыць з кожным годам становіцца лепш і весялей.

Гэта не казка, а—быль і ява. І героямі гэтага ператварэння з'яўляюцца не чуда-багатыры, якім варожыць «сила нездешняя», а простыя совецкія людзі, пад геніяльным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, на чале с партыяй Леніна і Сталіна, зрабіўшыя такое дзіўнае ператварэнне. І калі ўспомнім пройдзены шлях, шлях жорсткай барацьбы і бліскучых перамог, тады робіцца ясным, як зарадзіўся, умацаваўся і выпрацаваўся ў працэсе рэвалюцыйнай барацьбы сённешні блок комуністаў і беспартыйных.

Гэты блок зарадзіўся на палях баёў грамадзянскай вайны, калі на чале з комуністамі і плячом к плячу з імі байцы Чырвонай Арміі з беспартыйных рабочых і сялян разгромілі белых генералаў і чужаземных інтэрвентаў. Гэты блок умацаваўся ў годы баёў першай і другой пяцігодак, калі па геніяльнаму плану Сталіна, пад кіраўніцтвам комуністаў і рука ў руку з комуністамі энтузіясты індустрыялізацыі і калектывізацыі з беспартыйных рабочых і працоўных сялян будавалі рад заводаў-гігантаў, Днепрагрэс, Турксіб, абаронныя заводы, арганізоўвалі калгасы ў бясстрашнай барацьбе з шалёнымі псамі контррэволюцыі, громячы троцкісцкіх і бухарынска-рыкаўскіх бандытаў, шкоднікаў, шпіёнаў і дыверсантаў, ліквідуючы кулакоў. Комуністы і энтузіясты-беспартыйныя заклалі фундамент соцыялістычнага грамадства і будуюць цяпер самы будынак соцыялізма.

Але барацьба яшчэ не закончана. Сілы контррэволюцыі збіраюцца на рубяжах нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны. Непераможны блок комуністаў і беспартыйных стаіць перад новай, трэба спадзявацца, апошняй схваткай з азвярэлым фашызмам, які ўзброіўшыся да зубоў, рыхтуецца накінуцца на нашу квітнеючую радзіму. Блок комуністаў і беспартыйных—залог канчатковай перамогі. Як несакрушальная скала, сустрэне ён ворагаў; ён канчаткова разгроміць фашысцкія полчышчы і расшырыць прасторы соцыялізма далека за граніцы нашага Саюза.

Вось чаму я, як свядомы совецкі грамадзянін, як патрыёт сваёй соцыялістычнай радзімы, як гісторык-марксіст, асмысліваючы мінулае і ўлаўліваючы надыходзячае, з пачуццём шчасця і гонару іду галасаваць за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных і заклікаю да гэтага ўсіх выбаршчыкаў.

Няхай жыве перамога блока комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве наш бацька, настаўнік і друг, наш любімы таварыш Сталін!

Акадэмік Н. М. НІКОЛЬСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Облліт № 3928. Тыраж 1.500. Адказны рэдактар І. ЛЕВІН.